**Ганаровыя грамадзяне Навагрудскага раёна**



**Канавалаў Васіль Андрэевіч** - генерал- маёр, былы камандзір 283 Гомельскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі, якая ў ліпені 1944 года вызваляла г.Навагрудак ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (пасмяротна);



**Каваленка Ціхан Аляксандравіч** - палкоўнік, былы начальнік палітаддзела 283 Гомельскай Чырванасцяжнай стралковай дывізіі, якая ў ліпені 1944 гады вызваляла г.Навагрудак ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (пасмяротна);



**Мельнікаў Аляксандр Лявонцьевіч** - генерал-маёр, былы начальнік артылерыі 856 стралковага палка 283 стралковай дывізіі, якая ў ліпені 1944 года вызваляла г.Навагрудак ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў (памёр);



**Каган Джэк (Ідэль)** - былы вязень Навагрудскага яўрэйскага гета, удзельнік партызанскага руху ў Беларусі ў перыяд Вялікай Айчыннай вайны 1941-1945 гадоў. Арганізатар і актыўны ўдзельнік работы па ўвекавечанні памяці ахвяр фашысцкага генацыду ў перыяд Халакоста ў Навагрудку. Занесены ў Кнігу Славы Навагрудчыны. Ураджэнец Навагрудчыны.Памёр у 2017 годзе.



**Гахович Валянціна Георгіеўна** - Беларускі педагог. Народны настаўнік СССР. Заслужаны настаўнік БССР. Былы настаўнік рускай мовы і літаратуры сярэдняй школы №3 г. Навагрудка. Унесла значны ўклад ва ўдасканаленне форм і метадаў вучэбнай і выхаваўчай працы ў школе. Падрыхтавала вялікую колькасць навучэнцаў-пераможцаў і прызёраў усесаюзных, рэспубліканскіх, абласных, раённых алімпіяд і конкурсаў. Абіралася намеснікам старшыні Камітэта Савецкіх жанчын. Занесена ў Кнігу Славы Навагрудскага раёна. Памерла 12 мая 2019 года.



**Высокапраасвяшчэннейшы Гурый (Апалька)** - Арцыбіскуп Навагрудскі і Лідскі. Яго Эксцэленцыя, Высокапраасвяшчэннейшы Гурый з 1996года ўзначальвае Навагрудскую епархію Беларускай Праваслаўнай Царквы. Унёс значны ўклад у адраджэнне духоўных традыцый Навагрудчыны, умацаванне міжнацыянальнага і міжканфесійнага міру і згоды.



**Касцюк Міхаіл Паўлавіч** - Беларускі гісторык. Акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Доктар гістарычных навук, прафесар. Сапраўдны член Цэнтральнай Еўрапейскай акадэміі навук і мастацтва, Міжнароднай акадэміі навук Еўразіі. Былы дырэктар Інстытута гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі. Аўтар і рэдактар шматлікіх навуковых выданняў па гісторыі Беларусі. Унёс значны ўклад у арганізацыю гістарычнай навукі ў Беларусі, вывучэнне і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны Навагрудчыны. Занесены ў Кнігу Славы Навагрудчыны. Памёр 5 лютага 2019 года.



**Нікалаеў Мікалай Віктаравіч** - беларускі і расійскі гісторык, краязнаўца, культуролаг. Доктар філалагічных навук. Адзін з заснавальнікаў Міжнароднай асацыяцыі беларусістаў Беларускага грамадска-культурнага аб'яднання ў Санкт-Пецярбургу. Аўтар шматлікіх навуковых прац па гісторыі Беларусі, Расіі, Польшчы, Украіны. Працуе ў Расійскай Нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу. У дзіцячыя і юнацкія гады пражываў на Навагрудчыне. Унёс значны ўклад у вывучэнне гісторыі Беларусі і шэрагу замежных краін, вывучэнне і захаванне гісторыка-культурнай спадчыны Навагрудчыны, арганізацыю навуковых нацыянальна- культурных сувязяў паміж навукоўцамі і грамадскасцю Беларусі і Расіі. Занесены ў Кнігу Славы Навагрудскага раёна. Пражывае ў Санкт-Пецярбургу.